МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

пр. Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БІК: AKBB BY 2X; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «ААБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

пр. Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БИК: AKBB BY 2X; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

27.09.2018 № 02-01-16/5694

На № ____________ ад ______________

Аблвыканкамы,
Мінгарвыканкам

УА “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”

Грамадскія аб’яднанні
*(па спісе рассылкі)*

Сродкі масавай інфармацыі
*(па спісе рассылкі)*

У адпаведнасці з пунктам 106 Рэспубліканскай праграмы мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь 2018 – 2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы Міністэрствам культуры разам з зацікаўленымі аб’яўлены конкурс па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы.

У сувязі з гэтым просім інфармаваць зацікаўленых, а таксама да 28.09.2018 прадставіць кандыдатуры для ўключэння ў склад журы конкурса.

Дадатак: загад Міністра культуры Рэспублікі Беларусь ад 20.09.2018 № 152

Намеснік Міністра А.А.Яцко

02-01 Бацян 203 94 13

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

## ЗАГАД

## ПРИКАЗ

20.09.2018 № 152

г. Мінск

г. Минск

Аб арганізацыі і правядзенні конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы

На падставе пункта 106 Рэспубліканскай праграмы мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь 2018 – 2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2018 г. № 547,
ЗАГАДВАЮ:

1. Арганізаваць і правесці з 17 верасня па 1 лістапада 2018 г. конкурс па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы.

Міністр Ю.П.Бондар

Зак. 1335.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад
Міністра культуры
Рэспублікі Беларусь
20.09.2018 № 152

ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы

1. Дадзенае Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы (далей – Палажэнне) вызначае парадак арганізацыі і правядзення рэспубліканскага творчага конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы (далей – конкурс).

2. Мэтамі конкурсу з'яўляюцца:

рэалізацыя задач дзяржаўнай культурнай палітыкі;

фарміраванне павагі да "малой радзімы", уклад у яе развіццё;

прыцягненне грамадскай увагі да правядзення Года малой радзімы;

вызначэнне найбольш выразнага агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы.

3. Арганізатарам конкурсу з'яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

4. Конкурс з'яўляецца адкрытым па складу ўдзельнікаў. У конкурсе могуць прымаць удзел фізічныя, юрыдычныя асобы і аўтарскія калектывы Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў.

5. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца на афіцыйных сайтах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь і ў сродках масавай інфармацыі, змяшчае звесткі аб конкурсе, яго ўмовах, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых удзельнікамі матэрыялаў, парадку і тэрмінах абвяшчэння вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

6. Для прыняцця ўдзелу ў конкурсе ў тэрмін па 15 кастрычніка 2018 г. уключна падаецца заяўка па форме згодна з дадаткам да дадзенага Палажэння па адрасе: г.Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 304, кантактны тэлефон + 375 17 203 73 63. Да заяўкі дадаюцца конкурсныя матэрыялы.

7. Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ў электроннай форме ў выглядзе каляровай выявы. Фармат файла – .jpg, .psd, .cdr, .ai. Дазваляючая здольнасць не меньш 600 dpi. Памер файла не больш 2 Мб.

Да электроннай формы выявы павінна дадавацца каляровая раздрукоўка на фармаце А3, а таксама кароткая тлумачальная запіска, якая раскрывае творчую ідэю аўтара.

8. У мэтах захавання ананімнасці аўтараў конкурсныя матэрыялы прадстаўляюцца ўдзельнікамі пад чатырохзначным нумарам, які ўказваецца на ўсіх матэрыялах у левым верхнім куце, а таксама на канверце ўдзельніка конкурсу.

У запячатаны канверт удзельніка конкурсу ўкладваюцца інфармацыйны ліст, які змяшчае прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), а таксама адрас і кантактны тэлефон удзельніка альбо калектыву ўдзельнікаў конкурсу.

Пры парушэнні ўмоў конкурсу і правіл афармлення і прадстаўлення конкурсных матэрыялаў праект не разглядаецца.

9. Арганізатар не вяртае атрыманыя конкурсныя матэрыялы ўдзельнікам конкурсу.

10. Паштовыя і іншыя выдаткі ўдзельнікаў конкурсу аплачваюцца за іх кошт.

11. Сваёй заяўкай удзельнік пацвярджае аўтарства выявы. У выпадку парушэння аўтарскіх і сумежных правоў у конкурснай рабоце, адказнасць нясе ўдзельнік конкурсу.

12. Удзельнік конкурсу, накіроўваючы конкурсныя матэрыялы пацвярджае сваю згоду ў выпадку перамогі ў конкурсе на бязвыплатнае адчужэнне права на іх выкарыстанне на карысць арганізацыі, вызначанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

13. Конкурсныя матэрыялы разглядаюцца журы на закрытым пасяджэнні не пазней 1 лістапада 2018 г. Склад журы зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

14. Рашэнне прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу журы адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў "за" і "супраць" голас старшыні журы з'яўляецца вырашальным. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца яго старшынёй і сакратаром.

15. Крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў:

адпаведнасць умовам конкурсу;

высокі прафесійны і мастацкі ўзровень;

выкарыстанне арыгінальнага рашэння;

адлюстраванне найбольш выразнага вобраза, адпавядаючага мэтам конкурсу.

16. Журы конкурсу мае права не вызначаць пераможцу ў выпадку адсутнасці заявак, прызнання непераканӑўчымі ўсіх абгрунтаванняў або недастатковым прафесійны і мастацкі узровень усіх конкурсных матэрыялаў.

17. Канверты ўдзельнікаў конкурсу распячатваюцца пасля вынясення рашэння журы па выніках конкурсу.

18. Рашэннем журы вызначаецца выява, якая займае першае месца ў конкурсе і пераможца конкурсу.

19. Пераможцу конкурсу прысуджаецца грашовая прэмія ў памеры 50 базавых велічынь.

Грашовая прэмія пералічваецца на разліковы рахунак пераможцы конкурсу, зыходзячы з памеру базавай велічыні на дату зацвярджэння вынікаў конкурсу.

У выпадку перамогі калектыву аўтараў, грашовая прэмія дзеліцца паміж удзельнікамі калектыву ў роўных частках.

20. Арганізатар пакідае за сабой права пры неабходнасці дапрацаваць выяву з улікам заўваг членаў журы.

21. Вынікі конкурсу публікуюцца ў тыднёвы тэрмін пасля вынясення рашэння журы на афіцыйных сайтах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.

23. Фінансаванне выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2016-2020 гады (падпраграма “Мастацтва і творчасць”), а таксама за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак
да Палажэння аб парадку
арганізацыі і правядзення
конкурсу па стварэнні
агульнарэспубліканскага сімвала
Года малой радзімы

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

______________________________________
прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку
(калі такое маецца),

______________________________________
тэлефон

## ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў конкурсу па стварэнні агульнарэспубліканскага сімвала Года малой радзімы.

З умовамі конкурсу азнаёмлен і згодзен.

У выпадку перамогі ў конкурсе, абавязваюся перадаць арганізацыі, вызначанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, правы на выкарыстанне выявы, у тым ліку пры дапрацоўцы мастацкага рашэння, шляхам заключэння адпаведнага дагавора.

У выпадку невыканання мной умовы, названай у вышэйадзначаным абзацы, абавязваюся вярнуць атрыманае мной узнагароджанне за перамогу ў конкурсе ў поўным памеры.

| ____________________ | ____________________ | ________________ |
|---|---|---|
| ініцыялы, прозвішча | подпіс | дата |